# «Спрадвечная прыгажосць», або Песня мужнасці Зінаіды Дубовік: новая выстаўка ў галерэі мастацтваў імя У. С. Садзіна, якую абавязкова трэба наведаць



«Спрадвечная прыгажосць» Зінаіды Паўлаўны – філіграннай работы, заварожвае, здзіўляе і захапляе. Здаецца неверагодным, што ў вышыўцы можна перадаць не толькі колеравыя нюансы, але і выраз твару, вачэй.

Углядзіцеся ў вышытыя партрэты, пейзажы, паспрабуйце без дэталёвага вывучэння адрозніць іх ад работ акварэллю. Аплікацыя, інкрустацыя бісерам, вышыўка і карціны акварэллю на тканіне – Зінаіда Паўлаўна спалучае ў сваіх творах розныя тэхнікі. Гэты таленавіты чалавек яшчэ вяжа кручком (звярніце ў экспазіцыі ўвагу на столік, «накрыты» для чаяпіцця), працуе з прыродным матэрыялам, піша вершы.



– Я ўлюбёная ў беларускую мову, заслухваюся ёй. Сама, на жаль, не валодаю літаратурнай мовай – вучылася ў Расіі, але ж чытаць беларускія вершы, слухаць беларускіх артыстаў, беларускі тэатр – вельмі люблю. Гэтым, здаецца, толькі і жыву, – расказвала Зінаіда Паўлаўна падчас адкрыцця выстаўкі.

Наведвальнікі галерэі, уражаныя майстэрст-вам вышывальшчыцы, уважліва разглядвалі кожную работу, задавалі пытанні Зінаідзе Паўлаўне, выказвалі сваё захапленне яе мужнасцю і дзякавалі за творчасць.

Зінаіда Паўлаўна сапраўды вельмі моцны чалавек. З дзяцінства ў яе цяжкае захворванне, якое дастаўляе нямала пакут. З першых пасляваенных гадоў дзяўчынка з Белай Лужы лячылася і вучылася далёка ад радзімы. Яна вельмі многа чытала, любіла маляваць. Зінаіда Паўлаўна – творчая натура, працалюбівая, настойлівая, мэтанакіраваная. Скончыўшы школу, атрымала сярэднюю медыцынскую адукацыю, працавала ў Мінску, Салігорску, а ў 1988 годзе пераехала ў Гацук. Убачыўшы аднойчы партрэты любімых класікаў, захацела вышыць іх. Так атрымалася цэлая галерэя партрэтаў, значная частка якіх цяпер належыць Слуцкаму краязнаўчаму музею – Зінаіда Паўлаўна падарыла 15 вышытых карцін.



Дарэчы, першая выстаўка работ Зінаіды Паўлаўны Дубовік у Слуцку прайшла ў 2006 годзе. З таго часу ў яе калекцыі з'явіліся напісаныя акварэллю па тканіне пейзажы неверагоднай прыгажосці, таксама і вышытыя мелкай гладдзю. Адна з наведвальніц звярнула нашу ўвагу на адваротны бок вышытых «крыжыкам» рушнікоў – ні аднаго вузельчыка, ніякіх пераблытаных нітак. Колькі сілы духу, цярпення трэба мець чалавеку з абмежаванымі магчымасцямі, каб займацца творчасцю, ды так віртуозна валодаць майстэрствам. Толькі творца ведае, як даецца кожная работа.

– Ёсць такое жартаўлівае пажаданне: «Живите до ста лет, пока не рухнет ваш скелет». Дык вось мой шкілет ужо рухнуў у прамым сэнсе, але я жыву, – усміхаецца Зінаіда Паўлаўна. – А вось гэты мой шкілет, – яна абводзіць позіркам свае работы, – не рассыплецца да апошніх дзён.

Абавязкова наведайце выстаўку, без уражанняў не застанецеся.

Ірына Міргародава

Слуцкі край. – 2015. – 23 студз. – С. 13.